БІБЛІЯТЭКА САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

БИБЛИОТЕКА СОЮЗА ПИСАТЕЛЕЙ БЕЛАРУСИ

Таццяна МУШЫНСКАЯ

# САД МАІХ УСПАМІНАЎ

ПРОЗА
ПАЭЗІЯ
ПАДАРОЖНЫЯ НАТАТКІ

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2016

УДК 821.161.1(476)-1
ББК 84(4Беи)-5
М93

**Мушынская, Т. М.**

М93 Сад маіх у спамінаў : проза, паэзія, падарожныя нататкі / Таццяна Мушынская. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2016. — 268 с. — (Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі).

ISBN 978-985-7103-51-5.

У кнігу выбраных твораў Таццяны Мушынскай увайшлі аповесці, вершы, паэма, эсэ, абразкі.

Аповесць «Сад маіх у спамінаў» — пра жыццё нашых сучаснікаў у пасляваеннай і сённяшняй Грушаўцы, аднаго са старэйшых раёнаў Мінска. Музычныя згадкі «У прасторы сямі нот» распавядаюць пра асяроддзе беларускіх музыкантаў і спевакоў. Сярод уключаных у кнігу вершаў — і тыя, што сталі асновай вядомых рамансаў і песень. А ўражанні аўтара ад шматлікіх падарожжаў адлюстраваліся ў эсэ і абразках.

Выданне прызначана для шырокага кола чытачоў.

**УДК 821.161.1(476)-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-7103-51-5**

© Мушынская Т. М., 2016
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва "Чатыры чвэрці"», 2016

# ПРОЗА

# САД МАІХ УСПАМІНАЎ

## ДАКУМЕНТАЛЬНАЯ АПОВЕСЦЬ

*Чалавецтва заўсёды любіла і шанавала асоб грамадскіх. Тых, хто навідавоку і шмат робіць для іншых, а не толькі для сябе. Іх прэстыж быў і нязменна застаецца высокім, а прызнанне заслуг уздымае вышэй і вышэй па прыступках сацыяльнай лесвіцы. Але, на жаль ці на шчасце, асобы грамадскія — толькі невялікая частка чалавечай супольнасці. А большасць насельніцтва ў любой краіне складаецца з людзей прыватных. Са сваім, не менш цікавым і каларытным прыватным жыццём.*

*Інтэлігенцыя заўсёды захаплялася тым, што народжана фантазіяй, эмоцыямі і інтэлектам, шанавала талент, увасоблены ў творах мастацтва. У народным асяроддзі заўжды высока каціраваліся людзі, якія шмат што умеюць зрабіць рукамі. Зрабіць хораша, трывала, надзейна.*

## Частка першая

## ГРУШАЎКА

### Час і месца

Такім чынам, дзе і калі адбываецца дзеянне нашага аповеду?

На Грушаўцы, у адным з найбольш прыгожых і паэтычных куткоў Мінска. У апошнія гады ён актыўна забудоўваецца сучаснымі шматпавярховымі гмахамі. У лістападзе 2012 года адкрылася станцыя метро, якая так і называецца — «Грушаўка».

Але далёка не ўсе шчаслівыя навасельцы ведаюць, што менавіта на вуліцы Грушаўскай знаходзіліся вытокі легендарнай ракі Няміга, з якой цесна звязана ўся гісторыя старажытнага горада. У ХІХ стагоддзі тут пісаў свае пейзажы мастак Напалеон Орда, і самае дзіўнае, што яны захаваліся! Калісьці Грушаўскі пасёлак лічыўся ўскраінай Мінска, ён узнік у канцы ХІХ — пачатку ХХ стагоддзя. Тут сяліліся чыгуначныя рабочыя, гарадская беднота. Да Вялікай Айчыннай вайны і пасля яе раён не без падстаў лічыўся мінскім Гарлемам, дзе жыла публіка, вельмі розная па сваіх занятках і сацыяльным статусе.

Сёння гэта прастора, у якой суіснуе старое і новае, суседнічаюць візуальныя кантрасты. Эфектныя і суперсучасныя будынкі на праспекце Дзяржынскага — і закінутыя яблыневыя сады. Шыльды новых фірм — і старыя, скрыўленыя, але ад таго не меней к аларытныя платы. Пеўні, куры, козы ходзяць па завулках, а зусім недалёка імчацца па асфальце сучасныя машыны. Патрыярхальныя пейзажы кантрастуюць з зіхоткімі фасадамі банкаў. Стары кінатэатр «Авангард» на вуліцы Папаніна, закінуты парк побач з ім, двухпавярховыя баракі па вуліцы Шчорса — і новая, трохузроўневая развязка на скрыжаванні праспектаў Дзяржынскага і Жукава.

Некалі ад старой Грушаўкі, якая заўжды нагадвае зялёны востраў, што плыве паміж імклівымі магістралямі, можа нічога не застацца. Паўстане новы, прэстыжны мікрараён, блізкі да цэнтра і вакзала, з шыкоўнымі кватэрамі і развітай інфраструктурай. Тым больш дарагая сэрцу, тым больш каштоўная, як кажуць кінематаграфісты, «уходящая натура».

Як спалучаліся тут рысы гарадскога і вясковага побыту і ўкладу? Як жылі да вайны і пасля яе? Як змяняліся ўмовы і рэаліі паўсядзённага жыцця ў 60-я і 70-я гады? Якімі паўставалі людзі, што засялялі гэты прыгожы і паэтычны раён горада? Менавіта на такія пытанні я і паспрабую даць адказ.

Сама назва «Грушаўка» і ўсё, што з ёй звязана, дарагія для мяне. Як і назвы вуліц Разінская, Дзекабрыстаў, Папаніна, Шчорса, Чыгуначная. На вуліцы Грушаўскай я нарадзілася і пражыла першыя шэсць гадоў. Тут больш як паўстагоддзя стаяла хата дзядулі і бабулі. Недалёка, на Разінскай, нарадзілася мая мама, прайшлі тры першыя дзесяцігоддзі яе жыцця. Праз шмат гадоў даведалася, што з маёй любімай Грушаўкай звязаны таксама лёсы вядомых у краіне творчых асоб — пісьменніцы Галіны Васілеўскай, паэта Анатоля Аўруціна, кампазітара Марыны Марозавай.

Успаміны дзяцінства — бяздонны калодзеж, з якога чалавек чэрпае потым усё наступнае жыццё. Важна толькі, каб вада ў ім была чыстая. Сталы, дарослы чалавек, затузаны паўсядзённымі справамі і неабходнасцю штодня выпраўляцца на службу і зарабляць грошы, можа і не памятаць пра падзеі, якія здарыліся з ім учора або пазаўчора. Але карціны таго, што адбывалася з ім у пяць-шэсць-сем гадоў, застаюцца ў памяці назаўжды. І потым многія гады з'яўляюцца неацэннай каштоўнасцю, крыніцай радасці і душэўнай чысціні. Камертонам, які вызначае дакладнасць ці фальш, шчырасць ці крывадушнасць нечых слоў, учынкаў і дзеянняў.

## «Даганяючы — не нацалуешся!»

Марыя Іванаўна, мая бабуля, сядзіць і шые. Я ўладкавалася побач і распавядаю пра сваё студэнцкае жыццё. Згадваю сяброўку, якая моцна кахае хлопца. Кахае — але здаля… А той не надта часта пазірае ў яе бок.

Бабуля даслухала, паднімае галаву ад свайго шытва і з непахісным перакананнем кажа:

— Ой, унучачка! Нічога з гэтага не будзе. Даганяючы — не нацалуешся!

Колькі разоў потым я згадвала бабуліны словы, слухаючы драматычныя сардэчныя гісторыі сяброўак, знаёмых ці зусім чужых, выпадкова сустрэтых людзей. Бо з дваіх, Яго і Яе, хтосьці адзін заўсёды любіць больш. Сапраўды, даганяючы — не нацалуешся… І трапна, і ёмка, і па сутнасці. Інтанацыю таго сказа памятаю да сённяшняга дня.

Паразуменне ці адсутнасць яго, драматызм адзіноты жанчыны ці адзіноты мужчыны, якія не могуць знайсці сваю палавінку. Шматлікія эмацыйныя і псіхалагічныя праблемы адносін Яго і Яе можна растлумачыць праз гэты кароткі афарызм. У падтэксце падказка, што для шчасця патрабуецца ўзаемнасць, а не прыдумкі, мары, адарваныя ад рэальнасці. І калі чамусьці не складаецца — тут, цяпер і з гэтым чалавекам, значыць, і не павінна скласціся.

Дагэтуль не магу адказаць сабе на пытанне: адкуль у бабулі, якая ніколі не вучылася ў школе, нават пачатковай, не пісала сачыненняў, не чытала аповесцяў і раманаў пра каханне, не вывучала аб'ёмныя кніжкі па псіхалогіі сям'і, такое па-снайперску дакладнае разуменне сутнасці кахання і шлюбу? Гэта вынік назіральнасці, прыроднага розуму і дасціпнасці? Тады атрымліваецца, што жыццёвая мудрасць амаль не залежыць ад адукацыі і колькасці прачытаных кніг.

Такое невынішчальна-аптымістычнае ўспрыманне рэчаіснасці, здарова-цвярозае і сакавіта-гумарыстычнае, асабіста я лічу моцным псіхалагічным сродкам супраць хваробы, якая называецца інтэлігенцкай меланхоліяй, лекамі ад празмернай далікатнасці, паратункам ад імкнення плакаць і плакацца, шкадаваць невядома пра што і імкнуцца ў невядомую далячынь. Нібыта там, дзе нас няма, і знаходзіцца шчасце. А мо-

жа, яно блізка, побач? Толькі мы не заўсёды пра тое здагадваемся.

## «Жаніся, каб дурні не звяліся…»

Як вядома, мова чалавека — адлюстраванне яго-нага мыслення.

Марыя Іванаўна была адным з самых выдатных стылістаў і знаўцаў беларускай лексікі і фразеалогіі, якія мне трапляліся ў жыцці. Хутчэй за ўсё, і не ведала, што азначаюць словы «лексіка» і «фразеалогія», але крамяныя слоўцы і сакавітыя выразы літаральна сыпаліся з яе вуснаў. Так, як сыплецца гарох з дзіравага меха. Адно за адным і заўсёды дарэчы.

«Хто ў лесе не злодзей — той дома не гаспадар!» (адна з любімых яе прымавак — пры тым, што бабуля за ўсё сваё жыццё ніколі нават чужой ніткі не ўзяла). Памятаю, як доўга і нястрымана заходзіліся ад смеху мае знаёмыя салісткі оперы, калі аднойчы агучыла ў кулуарах тэатра афарызм Марыі Іванаўны.

«Хто спіць, той не грашыць». «Не дай, Божа, свінні рогі, а мужыку — панства». Колькі здаровага гумару, невычэрпнага аптымізму ў кожным з гэтых выразаў! Якое паўнагучнае, па-раблезіянску сакавітае ўспрыманне рэчаіснасці!

«Каб твае кляты, ды табе ў пяты» (інакш кажучы, каб табе вярнулася тое, чаго ты жадаеш іншым). Гэта пра чалавека, які схільны клясці ўсіх запар.

А вось яшчэ: «Да пары збан ваду носіць — ручка адарвецца, збан разаб’ецца». «Абедаў — ды жывот не ведаў», — любімая прымаўка дзеда Фёдара, калі запрашаў за стол гасцей, якія аднекваліся: маўляў, мы ўжо абедалі. «Абед на абед не пашкодзіць», — адказваў ім Фёдар Фёдаравіч.

Некаторыя выразы былі, магчыма, і грубаватыя, але без злосці, заўсёды з прыхаванай смяшынкай: «Пень прыбяры, і той прыгажэйшы!».

Вяртаемся разам з крамы. Пад плотам ляжыць п’яны. Спіць. «Ніякая трасца з ім не зробіцца!», — спакойна і крыху іранічна каментуе бабуля.

У гарадскіх дзяцей і падлеткаў, якія вывучаюць мову па кнігах, па творах літаратуры, а не ў жывым і натуральным моўным асяроддзі (а яго ніколі зашмат у горадзе не было), мова амаль заўсёды мае смак дыстыляванай вады. Нібыта і вада, нібыта і празрыстая, нібыта і смагу наталяе… А не калодзежная, не крынічная. Смаку сапраўднага — няма… Няма, і ўсё тут!

Людзям, не заклапочаным думкамі пра ўласны імідж, службовую дыпламатыю, пра тое, што каму можна сказаць, а што нельга, хто што падумае і каму перадасць, — такім людзям заўсёды ўласцівая арганічнасць самавыяўлення ў слове. Натуральнасць паводзін, лексікі і ацэнак — сітуацыі, іншых людзей, самога сябе.

Вельмі шкадую цяпер, што не запісвала дваццаць, трыццаць гадоў таму. Школьніцай, потым студэнткай. Не запісвала не тое што асобныя сказы, а ўсё запар! Бо ўсведамленне неацэннай каштоўнасці такіх прыказак і прымавак, такой мовы прыйшло пазней. А тады было проста цікава і весела слухаць, бо каларытныя слоўкі ствараюць добразычлівую і нязмушаную, а галоўнае — сардэчную атмасферу.

«Што я буду сядзець, як атручаная?» Гэта значыць нерухома, моўчкі, як быццам ты спруцянелы.

«Яму палец у рот не кладзі», «Да трох не гавары» — пра чалавека наравістага, з характарам. «Узялася за дзела, як вош за цела» — пра чалавека стараннага, аж празмерна. «Пнецца, як жаба на корч» — пра таго, хто пераацэньвае ўласныя магчымасці. З вуснаў Марыі Іванаўны ўпершыню пачула выраз «пацеры казаць» (значыць, малітвы прамаўляць).

Глядзім разам тэлевізар. У кадры — негр ці, як цяпер прынята фармуляваць, афраамерыканец. Пэўна, з Цэнтральнай Афрыкі, бо чорны-чорны, як сажа. Бабуля кажа



## МУШЫНСКАЯ ТАЦЦЯНА МІХАЙЛАЎНА

Нарадзілася ў Мінску. Скончыла факультэт журналістыкі БДУ. Працавала ў газеце «Літаратура і мастацтва», з 1991 года — у часопісе «Мастацтва». У рэспубліканскай перыёдыцы выступае з 1975 года.

Пісьменніца, журналістка, тэатральны крытык, лібрэтыст. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Выдала кнігі прозы «Доўгае развітанне» (1997), «Джульета і экстрасэнс» (2013), зборнікі апавяданняў, казак і вершаў для дзяцей «Віця Неслух у краіне мурашоў» (1995), «Калі тата — Дзед Мароз» (2000), «Свята печанай бульбы» (2003), «Вожыкі ў футбол гуляюць» (2008), «Хто ў лесе самы смелы?» (2015). Аўтар зборнікаў вершаў «Я вандрую ў стагоддзях» (1998), «Рабро Адама» (1999), «Души ожиданье» (2006), «Сны кахання» (2006), пяці кніг, прысвечаных беларускаму балету, шэрагу лібрэта для харэаграфічнай сцэны. Вершы перакладаліся на рускую, украінскую, англійскую мовы. Актыўна супрацоўнічае з многімі прафесійнымі беларускімі кампазітарамі. На вершы Т. Мушынскай напісана больш за 200 музычных сачыненняў — рамансы, вакальныя і харавыя цыклы, песні, вакальна-сімфанічная паэма, камічная опера. У Беларускай дзяржаўнай філармоніі прайшоў шэраг творчых вечароў паэтэсы.

Па стыпендыі Інстытута польскай культуры ў Парыжы стажыравалася ў Польшчы (Варшава, Кракаў) як тэатральны крытык і лібрэтыст (1997). Уладальнік дыплома «За пашырэнне ведаў пра тэатр Беларусі» Камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА (2008). Лаўрэат Нацыянальнай музычнай прэміі ў намінацыі «Лепшы журналіст (музычны крытык)» (2013).

# ЗМЕСТ

## ПРОЗА

**САД МАІХ УСПАМІНАЎ**
ДАКУМЕНТАЛЬНАЯ АПОВЕСЦЬ

Частка першая
**ГРУШАЎКА**

Час і месца . . . . . . . . . . 3
«Даганяючы — не нацалуешся!» . . . . . 5
«Жаніся, каб дурні не зваліся...» . . . . 7
Краўчыха . . . . . . . . . . 12
Што Марыя Іванаўна ўмела шыць? . . . . 15
З чаго складаецца прафесіяналізм . . . . 16
Што ўмеў рабіць дзед Фёдар? . . . . . 21

Частка другая
**ЛАМАКІ, САДОЎСКІЯ І КЛЯНОЎСКІЯ**

У наваколлі губернскага Мінска . . . . 27
Марыя Ламака, прабабуля . . . . . . 28
Іван Садоўскі, прадзед . . . . . . 30
Дзяцінства маёй бабулі . . . . . . 31
Кляноўскія. Дзед Тодар . . . . . . 33
Дзеці і гаспадарка . . . . . . . 34
Мальвіна Вікенцьеўна . . . . . . 35
Дзяцінства. Выхаванне . . . . . . 36
Суражскі базар . . . . . . . . 37
Замужжа. Нявестка . . . . . . . 38
Армія . . . . . . . . . . . 40
1932 год. У Мінску . . . . . . . 41
Сталоўка. Пачатак сталярства . . . . 43
«Дохі сабе спраўляюць!» . . . . . . 45
«Мальвіна, з торбамі пойдзеш!» . . . . 46
У старэйшай дачкі . . . . . . . 47
Кароль Лір у спадніцы . . . . . . 49

Вайна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 52
Акупацыя. Венікі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54
Лагер для ваеннапалонных. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
Як ратаваліся? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56
Доктар для жывёл і людзей. . . . . . . . . . . . . . . . . . . 58
Пасля вайны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59
Грунт. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60

Частка трэцяя
**УЗВЫШАНАЕ І ЗЯМНОЕ**
Жыццё як рытуал . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 61
Карагоды кветак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62
Курачкі — і белыя, і пярэстыя . . . . . . . . . . . . . . . . 64
Ад гарышча да склепа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
«От, абедзве вы вароны станькаўскія!» . . . . . . . . . 68
Арыі сярод бульбоўніку. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
Сад і агарод. Камароўка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71
Агульнае і рознае . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 72
Атмасфера. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 75
Клопат . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 77
Гоп! Гоп!. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 78
«Мухі выпілі!» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 80
«…І нічога не застанецца!» . . . . . . . . . . . . . . . . . . 81
«Што вас натхняе?..». . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 83
Замест эпілога . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 84

**У ПРАСТОРЫ СЯМІ НОТ**
МУЗЫЧНЫЯ ЗГАДКІ
Спяваюць — усе! . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 86
Клавішы белыя і чорныя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 87
Пад кіраўніцтвам Аляксандры Нікалаевай . . . . . . . . 89
Сукенка для іспанскага танца . . . . . . . . . . . . . . . . 91
Нашчадкі. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94
Няўжо нікому не трэба?.. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 95
Першая песня. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 96
«Мама — наша сонца» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97
Лёс асобнага верша . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 98
Музычныя вандроўкі «Дзеда Мароза» . . . . . . . . . . 99
Слова і музыка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 100

Гісторыя аднаго раманса . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 102
Мажор і мінор . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106
Ці заканчваюцца гукі? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 107
Першыя прэзентацыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 111
Загадка і — майстэрства . . . . . . . . . . . . . . . . . . 113
Харавая паэма. Падрыхтоўка . . . . . . . . . . . . . . . 115
Харавая паэма. Выкананне . . . . . . . . . . . . . . . . . 117
Інтэрпрэтацыі і інтэрпрэтатары . . . . . . . . . . . . 120
Начная прэм’ера . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 123
Пачуцці Барбары Радзівіл . . . . . . . . . . . . . . . . . 126
Нястомнасць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 128
Перформанс як жанр . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 131
Як нараджалася «Мора» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 132
Далёкі плёск хваль . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 136
«Калізей» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 137
У пошуках «Сноў» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 141
Ці лёгка напісаць гімн? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 145
«Толькі з вуснаў тваіх радасць піць…» . . . . . . . . 147
«Маё» і «не маё» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 148
Вакол слова «нагбом» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 151
«Сны». Вынік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 154
Прэм’ера, спадніца і… прас . . . . . . . . . . . . . . . . 156
Паміж «Полымем» і «Споведдзю» . . . . . . . . . . . . 158
Вопыт . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 159
«Рэпетыцыя аркестра» або «Рэпетыцыя хору»? . . . 161
Прысвечана Ганне Ахматавай . . . . . . . . . . . . . . . 164
Сілуэты Венецыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 168
«Шляхі ўсе вядуць у Рым…» . . . . . . . . . . . . . . . . 171
Пасля «Вандраванняў» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 175
Як знайсці агульную мову? . . . . . . . . . . . . . . . . . 176

ПАЭЗІЯ

**КАНЦЭРТ ДЛЯ ФАРТЭПІЯНА І ДАЖДЖУ**

ВЕРШЫ

«Сонца пазірае з-за хмар...» . . . . . . . . . . . . . . . 180
Графіка і жывапіс . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 180

«Як птушку поўніць радасць...» . . . . . . . . . . . . . . . 181
«Раяля чорнае крыло...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 181
«У кватэры маёй раней жыў паэт...» . . . . . . . . . . . . 182
Балет «Шапэпіяна». . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 182
«Шукальнікі жэмчугу...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 182
Кармэн і Мікаэла. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 183
Вадамеркі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 183
«Каштоўней што знайду за цішыню...» . . . . . . . . . . 184
Ратаванне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 184
Канцэрт для фартэпіяна і дажджу . . . . . . . . . . . . . 184
«Кожны чалавек падобны...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . 185
Маналог Барбары Радзівіл . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 185
«Увесь акіян музыкі...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 186
Егіпет. Клеапатра . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 187
Дзень у Венецыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 188
Варшава. Кастрычнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 188
Фантастычнае падарожжа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 189

## АДНА-АДЗІНАЯ ЖАНОЧАЯ ДУША...
РАМАНСЫ

«Мяне закранула каханне...» . . . . . . . . . . . . . . . . . 190
Няўжо?. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 190
Адам і Ева . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 191
«Без цябе нічога не бывае...» . . . . . . . . . . . . . . . . . 191
«Прастора чужой душы...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 192
Рэха . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 192
Пегас і Парнас . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 193
«Ці зможа халодны мой розум...» . . . . . . . . . . . . . 193
«Расхінулася неба...». . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 194
«Адна-адзіная жаночая душа...» . . . . . . . . . . . . . . 194
Арэлі. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 195
«Завея віхурыць у прасторах бязмежных...». . . . . . . 195
«Цяпер я разумею сэнс малітвы...» . . . . . . . . . . . . 196
На кані . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 196
«Ноч без зор...». . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 197
«Рэўнасць...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 198
Любві абрад . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 198
«Ці то ранак...». . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 199
«Адышло, адбалела...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 199

«А скрыпка спявала, маліла...» . . . . . . . . . . . . . . . . . 200
Мелодыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 200
Прысутнасць Бога . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 201

## ВОДАР АКАЦЫІ БЕЛАЙ
ПЕСНІ

Зялёны май . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 202
Летняя ноч . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 202
Водар акацыі белай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 203
Промень вачэй . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 203
Страла Амура . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 204
Русалчыны вочы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 204
Суцяшэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 205
Вецер у полі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 206
Маліннік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 206
Горкі прысмак расстайнай дарогі . . . . . . . . . . . . 207
З кірмашу. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 208
Гукі раніцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 208
Чараўніца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 209
«Лес сасновы — нібыта сабор...» . . . . . . . . . . . . 210
Заляцанні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 210
Развітальны час . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 211
Ліставей . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 211
У віцебскім небе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 212
Радзіма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 212
Серабранка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 213
Усе мы з хат . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 214

## ІТАЛЬЯНСКІ ТРЫПЦІХ

I. Рым . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 215
II. Міражы Венецыі. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 216
III. На прыступках Калізея. . . . . . . . . . . . . . . . 218

## ПРЫСВЯЧЭННЕ ШЭКСПІРУ

I. *З нагоды трагедыі «Гамлет»* . . . . . . . . . . . . . 219
II. *З нагоды п’есы «Бура»* . . . . . . . . . . . . . . . . 219
III. *З нагоды трагедыі «Антоній і Клеапатра»* . . . . . 220

## КАХАЮ...

ПАЭМА

I. «Зялёнае воблака — дрэва ў акне...» . . . . . . . . . . . . 221
II. «Ты хвалюеш мяне, як хвалі...» . . . . . . . . . . . . . . . 221
III. «Аддам табе сваю любоў. Аддам...» . . . . . . . . . . . .221
IV. «Я за сябе і за другіх люблю...» . . . . . . . . . . . . . . 222
V. «Як вярнуцца назад, як вярнуцца...» . . . . . . . . . . . 222
VI. «Не патрабую анічога...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . 222
VII. «П’янкое віно...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 223
VIII. «Як сказаць...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 223
IX. «Між бела-зялёнага светлага гаю...» . . . . . . . . . . . 224

ПАДАРОЖНЫЯ НАТАТКІ

## ФРАГМЕНТЫ ЕЎРАПЕЙСКАЙ МАЗАІКІ

Музей . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 226
У Кракаве — дождж . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 227
Вавель . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 227
Жыгімонт і Барбара . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 228
Вяртанне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 230
Старое Мяста . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 231
Сен-Санс на Святаянскай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 231
Міраж . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 232
Плошча Сан Марка. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 233
Жамчужнае паветра Венецыі. . . . . . . . . . . . . . . . . . 236
Рымскі форум . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 237
Вечны горад . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 239

## ПА СЛЯДАХ МОЦАРТА І СКАРЫНЫ

Культавыя імёны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 246
Дворжак і Сме́тана . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 248
«Самая музыкальная нацыя ў Еўропе» . . . . . . . . . . . 250
І драма, і опера, і балет . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 250

Музыка — паўсюль! . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 252
Карлаў мост . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 254
Усходні Парыж . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 255
Рэха Скарыны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 257

**Пра аўтара** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 260